■ Дзень смутку

# ТРАГЕДЫЯ НА БЛАКІТНЫМ БЕРАЗЕ

**Падчас тэракта ў Ніцы на Дзень узяцця Бастыліі загінула не менш за 84 чалавекі, сотні атрымалі траўмы. Па папярэдніх звестках, беларусаў сярод пацярпелых няма.**



Чарговы раз мішэнню тэрарыстаў стала Францыя. Увечары 14 ліпеня тысячы жыхароў Ніцы і шматлікія турысты выйшлі на Англійскую набярэжную, каб пабачыць салют, прысвечаны галоўнаму дзяржаўнаму святу краіны. Каля 23:00 у натоўп на высокай хуткасці ўрэзаўся грузавы аўтамабіль. Па словах відавочцаў, машына рухалася зігзагамі — каб зачапіць як мага больш людзей... Смяротны заезд працягваўся амаль два кіламетры, за гэты час пад колы трапілі дзясяткі прысутных, сярод іх больш як паўсотні дзяцей. Акрамя гэтага, кіроўца вёў агонь па людзях са зброі.

Усё скончылася толькі пасля перастрэлкі з паліцыяй — тэрарыст быў ліквідаваны. Паведамляецца, што грузавік меў куленепрабівальнае лабавое шкло, гэта і стала прычынай зацягвання аперацыі. Злачынца быў забіты выстралам у бакавое акно. У машыне знайшлі зброю, у прыватнасці гранаты (пазней высветлілася, што гэта былі муляжы), а таксама дакументы на імя 31-гадовага выхадца з Туніса, які меў туніскі і французскі пашпарты, паведамляе Agence France-Presse. Грузавік, па інфармацыі Le Figaro, быў узяты ў арэнду ў адным з гарадоў на Блакітным беразе. Паведамляецца, што мужчына раней ужо трапляў пад увагу праваахоўных органаў у сувязі з дробнымі правапарушэннямі. Выданне Nice Matin называе і яго імя — Махамед Ляўэж Булель, кіроўца службы дастаўкі, бацька трохгадовага дзіцяці.

Пакуль невядомы матывы, якія падштурхнулі тэрарыста да здзейсненага, таксама няма інфармацыі аб тым, ці былі ў яго саўдзельнікі. Паведамляецца, што ў кватэры мужчыны быў праведзены вобыск. Прыналежнасць Махамеда Буleля да радыкальных суполак не пацвярджаецца. У інтэрв'ю Nice Matin суседзі сцвярджаюць, што ён не быў падобны да рэлігійнага чалавека. Пакуль што ніводная з тэрарыстычных груповак не ўзяла на сябе адказнасць за здзейсненае. Але прэзідэнт Францыі Франсуа Аланд на начной прэс-канферэнцыі пасля трагедыі назваў тое, што здарылася, тэрактам.

Улады горада адмянілі ўсе грамадскія мерапрыемствы на бліжэйшы час, а таксама закрылі доступ на пляжы Ніцы. На няпэўны тэрмін закрыты і доступ на Англійскую набярэжную. У Францыі аб'яўлена трохдзённая агульнанацыянальная жалоба.

Як паведамляе прэс-служба беларускага Міністэрства замежных спраў, інфармацыя пра беларускіх пацярпелых у тэракце пакуль адсутнічае. Адсочваць сітуацыю працягвае пасольства Беларусі ў Францыі.



Свае спачуванні прэзідэнту Францыі Франсуа Аланду накіраваў беларускі лідар Аляксандр Лукашэнка. «З вялікім болем у Беларусі ўспрынялі паведамленне пра бязлітасны тэрарыстычны акт, які адбыўся 14 ліпеня 2016 года ў Ніцы ў значны для ўсёй Францыі дзень, — гаворыцца ў паведамленні. — Вялікая колькасць загінулых і параненых мірных грамадзян, наяўнасць сярод іх жанчын і дзяцей асабліва падкрэсліваюць нечалавечую сутнасць заказчыкаў і выканаўцаў тэракту».

«Беларусь рашуча асуджае любыя формы і праяўленні тэрарызму і экстрэмізму. Няма нічога больш важнага, чым мір і спакой у грамадстве, якія з'яўляюцца асновай устойлівага развіцця і дабрабыту кожнай дзяржавы», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Сваю заяву з нагоды трагедыі апублікавала і Міністэрства замежных спраў. У ёй гаворыцца, што ў Рэспубліцы Беларусь з глыбокім болем успрынялі паведамленне пра тэракт у Ніцы ноччу 14 ліпеня. У ведамстве падкрэсліваюць: асабліва цынічны характар здзейсненаму надае тое, што бесчалавечны акт тэрарызму адбыўся ў дзень святкавання французскім народам свайго нацыянальнага свята. «Беларускі бок рашуча асуджае ўсе праявы тэрарызму і лічыць, што акты гвалту ў дачыненні да цывільнага насельніцтва, якія пачасціліся апошнім часам, не могуць мець апраўдання і не павінны заставацца без жорсткай кансалідаванай рэакцыі сусветнай супольнасці» — гаворыцца ў заяве. Міністэрства выказвае спачуванні сем'ям і блізкім загінулых, а таксама жадае хуткага выздараўлення ўсім пацярпелым.

Тым часам у пасольстве Францыі ў Беларусі адкрылі кнігу спачуванняў, дзе кожны ахвотны можа пакінуць свае словы падтрымкі французскаму народу. Але праз абмежаваную колькасць людзей, якія можа прыняць установа, у пасольстве грамадзянам рэкамендуюць пісаць свае спачуванні на агульны электронны адрас дыппрадстаўніцтва webmestre.by@diplomatie.gouv.fr. Усе паведамленні перададуць уладам Францыі. На працягу дня беларусы неслі да будынка французскага пасольства кветкі і свечкі.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ**
*lyskavets@zviazda.by*

■

### У МУС аналізуюць тэракты ў Заходняй Еўропе

Як паведаміў Дзмітрый Кур'ян, начальнік упраўлення аховы правапарадку Міністэрства ўнутраных спраў, тэракты, якія адбываюцца ў Еўропе, старанна аналізуюць як у МУС, так і ў тэрытарыяльных органах унутраных спраў нашай краіны. Зыходзячы з абстаноўкі, уносяцца неабходныя карэктывы, змены ў арганізацыю грамадскага правапарадку, каб можна было пазбегнуць падобных сітуацый у нашай краіне.

**Якаў ЖУРБІН.**

■ Абітурыент-2016

# «ДА ПЯЦІ ГАДЗІН ПАЧАКАЮ, А ПОТЫМ ВЫРАШУ»

## Што адбывалася ў ВНУ ў апошнія гадзіны падачы дакументаў на бюджэтную форму навучання

**Лёгка выбіраць універсітэт для паступлення, калі дакладна ведаеш прахадны бал. Увесь тыдзень абітурыенты і іх бацькі маглі сачыць анлайн за ходам прыёмнай кампаніі. У чацвер пасля 15.00 сайты ВНУ перасталі абнаўляць інфармацыю. Як змяняўся конкурс на факультэтах, заставалася толькі гадаць. Што многія і рабілі. У апошнія гадзіны, калі можна было падаць дакументы на бюджэтную форму навучання, бацькі, адпрасіўшыся з працы, хваляваліся ў калідорах універсітэтаў, выпускнікі з невысокімі баламі за ЦТ верылі ў цуд, а члены камісіі клапатліва падказвалі, дзе яшчэ засталіся свабодныя месцы. Мы ж дзяжурылі ў БНТУ, у сценах якога ад натоўпаў сем'яў абітурыентаў і шалёнага напружання было вельмі горача.**



### Эпіцэнтр падзей

Побач з галоўным корпусам універсітэта ўсе лаўкі занятыя. Яшчэ колькі сем'яў дзяжураць ля ўваходу: чарговы раз ацэньваюць шанцы свайго дзіцяці і прымаюць рашэнне аб будучым месцы вучобы. Цяпер ужо канчаткова. Але большасць прыехала ў эпіцэнтр абітурыенцкіх падзей проста адсочваць сітуацыю.

— Мы падалі дакументы адразу ж, у першы дзень, на энергетычны факультэт, — расказвае мама Галіна з Бабруйска, якая тут разам з сынам. — Думаю, паступіць на бюджэт. У сына 250 балаў, і на спецыяльнасці, якую ён выбраў, — «Прамысловая цеплаэнергетыка» — яшчэ ёсць месцы. Чаму такую прафесію? Гэта запатрабавана.

На прыступках заўважаем вясёлую кампанію. Усе трое — са Слоніма.

— Ужо аднеслі дакументы? — цікавімся ў нядаўніх школьнікаў.

— Не. Да пяці гадзін пачакаю, а потым вырашу, — прызнаецца Лёша. — Або ў БНТУ, або ў «наргас» пайду.

— А з баламі што?

— Так сабе. На рэпетыцыйным тэсціраванні было больш — 263 разам з атэстатам. А тут хоп — і 182 толькі.

Як вызначыць, які конкурс на факультэтах, калі інфармацыя на стэндах больш не абнаўляецца, Лёша ўжо прыдумаў. Паходзіць па аўдыторыях, паглядзіць, куды іншыя абітурыенты бягуць, і выбера.

У яго прыяцелькі Каці сітуацыя тая ж. Дзяўчына здавала тэсты па матэматыцы, рускай і англійскай мовах, збіраецца на эканоміку. Ваня, яе брат-блізнюк, сядзіць пад універсітэтам за кампанію. Сам ён з выбарам вызначыўся яшчэ ў сераду і спадзяецца, што 187 балаў хопіць, каб вывучаць масты і транспартныя тунэлі.

### Сямейны ўніверсітэт

— Колькі ў вас балаў? 270? Вы пройдзеце, хвалявацца не варта, — супакойвае нечых бацькоў другакурснік Станіслаў Зайчанка.

Ён дапамагае прыёмнай камісіі факультэта інфармацыйных тэхналогій і робататэхнікі, дзе сам вучыцца. Дзяжурыць ля інфармацыйнага стэнда і кансультуе абітурыентаў і іх родных. «Пытанні стандартныя. Чым спецыяльнасці адрозніваюцца, якія будуць прахадныя балы... Тым, хто з баламі 170, тлумачу, што сюды на бюджэт трапіць няма шанцаў».

Чарга ў аўдыторыю, дзе прымаюць заявы ад будучых праграмістаў, велізарная. Але, па словах Стаса, дакументы з факультэта мала хто забірае.

Пад дзвярыма прыёмнай камісіі факультэта маркетынгу, менеджменту і прадпрымальніцтва разгаварыліся з абітурыентам Паўлам. Ён адзін з тых, хто перадумаў у апошні момант. Спачатку падаў дакументы ў БДТУ, але сёння зноў прымчаў у сталіцу з Ліды, каб перакінуць заяву ў іншы ўніверсітэт. «Тут спецыяльнасць больш падабаецца — «Гандлёвае абсталяванне і тэхналогіі». Хочацца з рэкламай працаваць. І па балах больш упэўнены». Са сваімі 193-ма баламі Паша лёгка абганяе ў рэйтынгу дванаццаць чалавек, якія прэтэндуюць на тую ж спецыяльнасць.

Бацькі Ігар і Наталля перажываюць за дачку. Заяву на факультэт яна даўно падала, але яны не ўпэўнены, што трапіць у лік бюджэтнікаў. Таму і дзяжураць тут. Пакуль іх Каця на спецыяльнасць «Кіраванне інавацыйнымі праектамі прамысловых прадпрыемстваў» праходзіць з запасам.

— Гэта табліца нічога не адлюстроўвае! У тры гадзіны ў кабінеце было чатыры абітурыенты, а іх сюды не ўпісалі, — раіць не давяраць бягучаму рэйтынгу адна з жанчын.

Ігар і Наталля смяюцца: канкурэнтаў не пропусцім у аўдыторыю. Сям'я жыве ў Гродне, але, хоць у мясцовым універсітэце ёсць падобная спецыяльнасць, выбар зрабілі на карысць БНТУ.

— Мы самі вучыліся ў гэтым універсітэце. Тут і пазнаёміліся, — настальгуе Ігар.

### Не трэба істэрык

— Будаўнікоў цяпер — процьма! Дзяваць няма куды, — не разумее, навошта ісці на будаўнічы факультэт, адна з дам. А мы тым часам размаўляем з абітурыентамі, якія палічылі, што спецыялісты ў гэтай галіне з «вышкай» лішнімі не будуць.

Аня з Баранавіч прыехала паступаць у апошні дзень не таму, што завалила ЦТ. Яе 297 балаў з улікам атэстату — добры вынік. Проста вучыцца дзяўчына планавала ў іншай ВНУ — Камандна-інжынерным інстытуце МНС. Для яе прыёмная кампанія пачалася яшчэ ў сакавіку. Аня праходзіла паглыбленае медыцынскае абследаванне, псіхалагічнае тэсціраванне, здавала нарматывы па фізпадрыхтоўцы. Нацэлілася на спецыяльнасць «Пажарная і прамысловая бяспека». Але там не засталося бюджэтных месцаў — амаль усе занялі хлопцы і дзяўчаты, якія праходзяць па-за конкурсам. Тады Аня ацаніла свае шанцы і вырашыла звязаць будучыню з экспертызай і кіраваннем нерухомасцю.

У апошні дзень падачы дакументаў на бюджэт абітурыентаў заўсёды шмат, заўважае **намеснік адказнага сакратара прыёмнай камісіі БНТУ Андрэй ДЗЕРБАН.** Калі ў сераду заявы прынеслі 900 чалавек, то ў чацвер — паўтары тысячы.

— Прахадныя балы ў апошнія гадзіны могуць змяніцца на працэнтаў 25-30, — дзеліцца назіраннямі Андрэй Мікалаевіч. — Але не трэба ўпадаць у істэрыку. Часам некаторыя абітурыенты з высокімі баламі пачынаюць сумнявацца ў сваіх шанцах, забіраюць дакументы, і ў выніку на факультэт залічваюць тых, хто набраў толькі сто з нечым балаў.

Што да спецыяльнасцяў, на якія конкурс стабільна вялікі, то гэта прафесіі эканамічнага блока, IT-галіны, энергетыкі. А самы высокі прахадны бал летась быў на напрамках «Бізнес-адміністраванне» (347), «Мытная справа» і «Кіраванне інавацыйнымі праектамі прамысловых прадпрыемстваў» (па 329).

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by.*
**Фота аўтара**

■